■ СЕМІНАР

# На парадку дня – ахова працы

**Дзень аховы працы прайшоў у ДЭУ-74 з удзелам спецыялістаў упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, па ахове працы арганізацый раёна і абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы.**



**Выступае начальнік ДЭУ-74 Андрэй Коласаў.**

Напачатку мерапрыемства інфармацыю аб дзейнасці ДЭУ-74 да ўдзельнікаў семінара давёў яго начальнік Андрэй КОЛАСАЎ, які таксама расказаў аб апошніх новаўвядзеннях у іх арганізацыі.

– Не так даўно мы прынялі рашэнне ўвесці новае патрабаванне, – адзначыў ён. – Цяпер усе нашы механізатары павінны атрымаць спецыяльнасць "слесар па рамонце дарожна-транспартнай тэхнікі". Наяўнасць яе дазваляе ажыццяўляць не толькі дробны рамонт тэхнікі, але і больш складаны.

Пра стан вытворчага траўматызму ў мінулым годзе, у прыватнасці – групавы няшчасны выпадак з вадзіцелямі ДЭУ-74, паведаміла інжынер па ахове працы Раіса САВІЦКАЯ.

Галоўны дзяржаўны інспектар працы абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Яраслаў БІЛАН абмеркаваў з прысутнымі тэму арганізацыі бяспечнай эксплуатацыі абсталявання, машын, механізмаў, забеспячэння работнікаў сродкамі індывідуальнай абароны.

– Агульныя патрабаванні бяспекі прапісаны ў Правілах па ахове працы, – адзначыў ён. – Згодна з імі, абсталяванне павінна адпавядаць усім патрабаванням Дзяржстандарта, мець інструкцыю па эксплуатацыі, забяспечвацца своечасовым і якасным абслугоўваннем і рамонтам.

Яраслаў Білан звярнуў асаблівую ўвагу на сродкі індывідуальнай абароны, паколькі менавіта ад іх залежаць бяспека і жыццё работнікаў. Адзначыў, што нормы выдачы СІА распрацаваны ў адпаведнасці з дзейнасцю арганізацыі. Больш дэталёва спыніўся на тэрмінах іх выдачы, а таксама на тым, што пры звальненні работнік мае права выбару: ён можа здаць СІА ці напісаць заяву, што пакідае іх сабе, але пры гэтым аплаціць іх кошт.

Аб прыёме на працу непаўналетніх, іх умовах працы, прымяненні заканадаўства аб аплаце працы маладым работнікам паведаміў галоўны дзяржінспектар працы абласнога ўпраўлення Дэпартамента дзяржінспекцыі працы Дзмітрый ДАЎГУН.



**У мерапрыемстве прымалі ўдзел спецыялісты па ахове працы арганізацый раёна.**



**Інжынер па ахове працы ДЭУ-74 Раіса Савіцкая дэманструе спецадзенне і сродкі індывідуальнай абароны, якія выкарыстоўваюцца ў іх арганізацыі.**

Начальнік раённай энергаінспекцыі Аляксандр АНТОНАЎ расказаў пра асноўныя патрабаванні да электратэхнічнага абсталявання, а старшы інспектар нагляду і прафілактыкі РАНС Юрый МАРОЗАЎ – з прывядзеннем канкрэтных прыкладаў аб забеспячэнні пажарнай бяспекі на вытворчасці.

Да ўвагі ўдзельнікаў семінара была прадстаўлена выстава спецадзення і сродкаў індывідуальнай абароны, якія выкарыстоўваюцца ў ДЭУ-74. Раіса Савіцкая пракаментавала, для каго і ў які перыяд года выдаецца спецвопратка, як часта работнікі атрымліваюць новыя СІА.

Напрыканцы дня аховы працы прысутныя прагледзелі фільм на тэму: "Стан аховы працы, роля грамадскіх інспектараў" і падвялі вынікі семінара.

**Марыя ШУТ.**
**Фота аўтара.**

■ КЛУБ МАЛАДОГА ПЕДАГОГА

# Маладыя і перспектыўныя

**Не так даўно ў СШ № 1 імя М.І. Пашкоўскага ў рамках работы "Клуба маладога педагога" адбыўся традыцыйны фестываль адкрытых урокаў маладых настаўнікаў установы.**



**Маладыя педагогі** (злева направа) **ЭлінаСтанішэўская, Таццяна Мельнікава, Сяргей Лістапад, Веранніка Мардачова і Антон Гарохаў абмяркоўваюць урокі сваіх калег.**

На працягу вучэбнага года яны займаліся самаадукацыяй: прымалі актыўны ўдзел у рабоце клуба, наведвалі ўрокі вопытных педагогаў і заняткі адзін аднаго з правядзеннем наступнага аналізу.

І ў выніку ўжо на адкрытых уроках яны паказалі, што засвоілі за гэты час. Урокі маладых настаўнікаў Сяргея ЛІСТАПАДА, Веранікі МАРДАЧОВАЙ, Эліны СТАНІШЭЎСКАЙ, Таццяны МЕЛЬНІКАВАЙ, Анастасіі ПІЛЮЦІНАЙ і Антона ГАРОХАВА атрымаліся цікавымі і запамінальнымі. Варта адзначыць, што на кожным з іх выкарыстоўваліся інтэрактыўныя метады навучання, і гэта давала магчымасць актыўна ўдзельнічаць у працэсе кожнаму вучню.

На пасяджэнні "Клуба маладога педагога" маладыя настаўнікі зрабілі самааналіз урокаў, сфармуліравалі задачы, якія яны будуць вырашаць ў наступным навучальным годзе.

**Алена ЗМІЁВА,**
**настаўнік матэматыкі і інфарматыкі,**
**кіраўнік "Клуба маладога педагога" СШ №1 імя М.І. Пашкоўскага.**

■ КОНКУРС

# Падарункі за творчасць

**Днямі начальнік райінспекцыі ПРіАНА Юрый СІМАНАЎ уручыў дыпломы і падарункі юным мастакам, якія занялі прызавыя месцы ў раённым этапе рэспубліканскага конкурсу на лепшы дзіцячы малюнак экалагічнай тэматыкі.**



**Ян Вілігураў прымаў падарункі ў прысутнасці аднакласнікаў.**

У ім прынялі ўдзел больш за трыццаць юных творцаў з устаноў дашкольнай, сярэдняй і дадатковай адукацыі па дзвюх узроставых катэгорыях: ад 3 да 5 гадоў і ад 6 да 10.

Усе дзіцячыя работы былі яркімі, крэатыўнымі, са сваёй адметнасцю, таму членам журы прыйшлося нялёгка. Тым не менш, для гэтага і быў абвешчаны конкурс, каб выбраць лепшых з лепшых.

У выніку, у малодшай катэгорыі пераможцамі сталі калектыўная работа выхаванцаў ясляў-садзіка № 16 аг. Ланькаў, наведвальнікі ясляў-садзіка № 2 Бялынічаў Яраслаў РУЦКІ і Яўгенія ШАЛКОЎСКАЯ з ясляў-садзіка № 9 аг. Вішоў.

У старшай групе былі адзначаны работы вучняў СШ № 2 Яна ВІЛІГУРАВА, Эсьмонскага ВПК ДС СШ Арсенія КУДРАЎЦА і Дзіяны СІДАРОВІЧ (Запольская СШ).

Пераможцы раённага конкурсу атрымалі дыпломы ад райінспекцыі ПРіАНА і аддзела адукацыі, спорту і турызму райвыканкама, а таксама падарункі – канцылярскія прыналежнасці для творчасці, каб у наступным годзе таксама ўвайсці ў лік пераможцаў спаборніцтва.



**Юрый Сіманаў віншуе Яраслава Руцкага з перамогай у конкурсе.**

**Марыя ШУТ.**
**Фота аўтара.**